беды «Память» (2000 г., БТ), Дню Независимости Республики Беларусь «Беларусь бязмежная» (2020 г., ОНТ), а также многочисленные творческие акции, среди которых можно отметить спортивно-театрализованный праздник «Мінск-88» (1988 г., БТ), сборный концерт «С любовью из Беларуси» с участием Я. Поплавской и А. Тихановича, И. Абалян, И. Дорофеевой, Жанет, В. Алешко, групп «Дрозды», «Тяни-Толкай» в г. Вильнюсе (Литва, 2008 г., ОНТ) и др. Ежегодно белорусскому зрителю предоставлялась возможность увидеть ТВ-версии праздничных концертов, посвященных памятным датам страны.

Таким образом, музыкальное искусство эстрады является неотъемлемой частью динамичной и разнообразной культурной жизни белорусского общества. Телетрансляция как форма презентации творчества белорусских эстрадных исполнителей выступает документом, отражающим динамику его развития в разных сферах. Наиболее популярными в период с конца XX до начала XXI в. в Республике Беларусь можно назвать авторские концерты, творческие вечера, встречи и концерты мастеров искусств, фестивали, конкурсы, сольные и сборные концерты.

## АХОВА НЕМАТЭРЫЯЛЬНАЙ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ: СУЧАСНЫ СТАН І АСНОЎНЫЯ ЗАДАЧЫ НА 2021–2025 гг.

***Г. М. Ходар,***
*кансультант упраўленння па ахове гісторыка-культурнай спадчыны Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь*

Беларусь надзвычай багата сваёй нематэрыяльнай (духоўнай) культурнай спадчынай, якая засталася нам ад продкаў. Без традыцый, звычаяў, абрадаў, народных рамёстваў досыць цяжка ўявіць вобраз беларускай культуры і асновы нацыянальнай ідэнтычнасці.

Нематэрыяльная культурная спадчына – гэта жывая спадчына, якая пастаянна развіваецца, мае сваіх носьбітаў і перадаецца з пакалення ў пакаленне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Разам з тым аб’ектыўныя працэсы (урбанізацыя, камерцыялізацыя) нясуць пэўныя небяспекі і рызыкі, якія могуць пагражаць пры неабдуманым выкарыстанні, або ўвогуле спыненні пераемнасці адпаведных традыцый, ведаў, навыкаў і ўменняў.

Пункт 173 Аператыўнага кіраўніцтва па выкананні Канвенцыі аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны [1] прызнае нематэрыяльную культурную спадчыну стратэгічным рэсурсам, які забяспечвае ўстойлівае развіццё краін. На міжнародных, нацыянальных і рэгіянальных узроўнях адзначаецца важнасць нематэрыяльнай культурнай спадчыны, замацаваны прававыя нормы аб распрацоўцы мер па захаванні адметных вартасцей элементаў, заахвочванні носьбітаў і пераемнікаў.

Артыкул 2 Канвенцыі ЮНЕСКА аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны 2003 (далей – Канвенцыя) адносіць да нематэрыяльнай спадчыны наступае: вусныя традыцыі і формы выражэння, уключаючы мову ў якасці носьбіта нематэрыяльнай культурнай спадчыны; выканальніцкае мастацтва; звычаі, абрады, урачыстасці; веды і звычаі, якія адносяцца да прыроды і сусвету; веды і навыкі, звязаныя з традыцыйнымі рамёствамі [3].

Канвенцыя вызначае наступныя крытэрыі нематэрыяльнай культурнай спадчыны:

1) павінна быць супольнасць або група людзей, якія з’яўляюцца носьбітамі нематэрыяльнай праявы творчасці чалавека;

2) павінна быць пераемнасць у перадачы ведаў і навыкаў ад пакалення да пакалення;

3) нематэрыяльная культурная каштоўнасць павінна ўсведамляцца самімі носьбітамі ў якасці сваёй культурнай спадчыны.

Рэспубліка Беларусь – адна з першых краін у свеце, якая далучылася ў 2006 г. да Канвенцыі [5] і ўвайшла ў склад Міжурадавага камітэта па ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА. З таго часу ў краіне праведзена вялікая праца па імплементацыі Канвенцыі ў нацыянальнае заканадаўства і дзейнасць устаноў культуры [8], унесены неабходныя змены ў прававыя акты, якімі сёння і рэгулюецца ахова нематэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны.

Дзяржавай праводзіцца вялізная праца па папулярызацыі спадчыны на міжнародным узроўні. Уклад беларускай культуры ў сусветную спадчыну і сусветную культуру бясспрэчны, але для прызнання нашых унікальных традыцый, абрадаў, ведаў у свеце трэба прыкладаць дадатковыя намаганні. Для гэта-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

га ў апошнія гады актывізавана работа па пашырэнні прысутнасці беларускіх аб’ектаў у спісах нематэрыяльнай спадчыны ЮНЕСКА.

Сёння Беларусь прадстаўлена чатырма элементамі, якія ўключаны ў спісы нематэрыяльнай спадчыны ЮНЕСКА (спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны, якая патрабуе тэрміновай аховы, рэпрэзентатыўны спіс нематэыяльнай культурнай спадчыны чалавецтва):

– у 2009 г. – «Калядныя цары» в. Семежава Капыльскага раёна Мінскай вобласці;

– у 2018 г. «Урачыстасць у гонар ушанавання абраза Маці Божай Будслаўскай (Будслаўскі фестываль)» у в. Будслаў Мядзельскага раёна Мінскай вобласці;

– у 2019 г. «Вясновы абрад “Юр’еўскі карагод”» у в. Пагост Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці;

– у 2020 г. – «Культура ляснога бортніцтва Беларусі і Польшчы».

Відэафільмы, фотаздымкі і апісанні ўсіх элементаў, у тым ліку і беларускіх, уключаных ў спісы ЮНЕСКА, змешчаны на сайце https://ich.unesco.org/en/lists.

У 2020 г. Міністэрствам культуры падрыхтавана дасье па элементу «Саломапляценне Беларусі: мастацтва, рамяство, уменні» і 30.03.2021 г. накіравана ў Сакратарыят Канвенцыі. Дадзенае дасье можа быць разгледжана ужо ў 2022 г. Па ініцыятыве Міністэрства культуры ўпершыню быў вывучаны і зафіксаваны сучасны стан бытавання саломапляцення на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь. Носьбітамі гэтых практык з’яўляюцца больш за 200 майстроў і рамеснікаў, якія жывуць у 85 раёнах і гарадах краіны, сярод якіх 20 атрымалі ганаровае званне «Народны майстар Беларусі».

У 2021 г. дадзены вопыт быў прыменены падчас уключэння Міністэрствам культуры ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь (далей – Дзяржспіс) элемента «Беларускае мастацтва выцінанкі» на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь. На пачатак гэтага года ў Беларусі носьбітамі беларускага мастацтва выцінанкі з’яўляюцца каля 100 майстроў, сярод якіх 11 маюць ганаровае званне «Народны майстар Беларусі», вырабы якіх характарызуюцца арганічным увасабленнем калектыўнага мастацкага вопыту беларускага наро-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

да, маюць выразную нацыянальную самабытнасць і мастацкую вартасць.

Гэтая дзейнасць працягваецца згодна з вызначанымі задачамі Дзяржаўнай праграмы «Культура Беларусі» на 2021–2025 гг.

У 2023 г. Гомельскім аблвыканкамам запланавана падрыхтоўка дасье па лакальнай нематэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці «Неглюбская народная тэкстыльная традыцыя» ў Веткаўскім раёне Гомельскай вобласці.

У 2024 г. Мінскім аблвыканкамам запланавана падрыхтоўка дасье з рабочай назвай «Культура дуды».

Падрыхтоўка такіх намінацый – дастаткова цяжкі і доўгі працэс, які патрабуе ўдзелу прадстаўнікоў навуковай і культурнай супольнасці, выканання аб'ёмнага тэкставага дасье на англійскай і беларускай мовах, стварэння відэафайла. Разглядаецца прапанова ў ЮНЕСКА на працягу 20 месяцаў (падаецца да 31 сакавіка аднаго года, а прымаецца рашэнне ў снежні наступнага года на сесіі Міжурадавага камітэта па пытаннях нематэрыяльнай культурнай спадчыны). На ўзроўні ЮНЕСКА рэгулярна аналізуецца дзейнасць краін, што ратыфікавалі Канвенцыю на падставе перыядычных дакладаў, якія падаюцца краінамі раз за 6 гадоў. Асаблівая ўвага надаецца элементам, якім патрабуецца тэрміновая ахова, справаздачы аб іх жыццядзейнасці прадастаўляюцца краінай спачатку кожны год, а пасля раз у тры гады. Справаздачы аб стане «Абрада "Калядныя цары"» і аб выкананні Канвенцыі рыхтаваліся Рэспублікай Беларусь у 2021 г.

У Дзяржспісе нямала іншых цікавых элементаў, якія сведчаць аб высокім укладзе нашага народа ў фарміраванне сусветнай спадчыны (багатыя традыцыі беларускага ткацтва, комплекс старажытных абрадавых гульняў («Жаніцьба Цярэшкі», «Яшчар», «Пахаванне дзеда», «Ката пячы» і г. д.).

Згодна з артыкулам 12 Канвенцыі для забеспячэння ідэнтыфікацыі з мэтай аховы кожная краіна, што далучылася да Канвенцыі, стварае адзін або некалькі публічных пералікаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны.

У Беларусі такімі рэсурсамі з'яўляюцца:

– Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь (Глава 3. Нематэрыяльныя гісторыка-культурныя каштоўнасці Рэспублікі Беларусь), які вядзецца з 1992 г. і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

з'яўляецца асноўным дакументам уліку гісторыка-культурных каштоўнасцей;

– Нацыянальны інвентар нематэрыяльнай культурнай спадчыны – сайт «Жывая спадчына Беларусі» (далей – Інвентар), створаны ў 2012 г., які змяшчае тэкставыя апісанні, матэрыялы фота-, аўдыя- і відэафіксацыі, выконвае задачы па ўліку і публікацыі вынікаў ідэнтыфікацыі і інвентарызацыі нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей, метадычнаму суправаджэнню падрыхтоўкі прапаноў аб наданні статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці [8]. Сёння ў Інвентар ўключаны звесткі пра 46 рамёстваў, 23 традыцыйныя цырымоніі, 13 выканальніцкіх мастацтваў, 11 традыцый кухні, 6 праяў светапогляду і міфалогіі, 5 вусных традыцый.

Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры (далей – Кодэкс), які ўступіў у сілу з 03.02.2017 г., значна пашырыў прававы статус нематэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны. У цэлым 17 артыкулаў Кодэкса ўтрымліваюць нормы, якія адносяцца да аховы нематэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны.

Артыкулы 103, 107 Кодэкса прысвечаны мерам па забеспячэнні захавання нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей (элементаў).

Ахова нематэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны ўключае ў сябе сістэму арганізацыйных, прававых, эканамічных, матэрыяльна-тэхнічных, навуковых, інфармацыйных і/або іншых мер, накіраваных на недапушчэнне істотнага змянення ўмоў або стварэння перашкод для бытавання, развіцця і перадачы нашчадкам гэтых каштоўнасцей. Адзначаныя меры прызваны забяспечыць жыццяздольнасць гісторыка-культурных каштоўнасцей, уключаючы іх ідэнтыфікацыю, дакументаванне, вывучэнне, захаванне, папулярызацыю і перадачу.

Крытэрыі ўключэння нематэрыяльных культурных каштоўнасцей у Дзяржспіс былі замацаваны ў артыкуле 92 Кодэкса і заснаваны на прынцыпах Канвенцыі, якую Рэспубліка Беларусь як дзяржава-ўдзельніца павінна выконваць. Каб элемент выявіць, неабходны ўдзел прафесіяналаў, якія змогуць яго зафіксаваць, уключаючы фота- і відэафіксацыю, апісаць і зрабіць навуковую і мастацкую ацэнку. Заканадаўства аб культуры дазваляе любой асобе падаць прапанову аб наданні статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці нематэрыяльнай культурнай каштоўнасці, падрыхтаваную з улікам патрабаванняў Канвен-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цыі і Кодэкса. Для падрыхтоўкі такіх прапаноў распрацаваны падрабязныя рэкамендацыі па запаўненні неабходнай інвентарнай формы, з якімі можна азнаёміцца на сайце Міністэрства культуры, а таксама на сайце «Жывая спадчына Беларусі» [2, 8, 10]. На практыцы такія прапановы ў Міністэрства культуры паступаюць ад мясцовых органаў, устаноў культуры і саміх носьбітаў. Колькасць элементаў, якія могуць быць намінаваныя і прапанаваныя для ўключэння ў Дзяржспіс, не абмежавана.

Патрабаванні Кодэкса да навуковай апрацоўкі і мастацкай ацэнкі культурнай каштоўнасці ўзнялі работу па вывучэнні адметных праяў нематэрыяльнай культурнай спадчыны на больш высокі навуковы ўзровень.

Варта адзначыць, што ў Беларусі за апошнія гады значна павялічылася колькасць элементаў, уключаных у Дзяржспіс. Напрыклад, калі ў 2016 г. выяўленых і ўзятых пад ахову дзяржавай элементаў было 76, то на сённяшні дзень у Дзяржспісе 155 нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей. З іх 36 катэгорыі «А» – поўныя аўтэнтычнасць і дакладнасць якіх безумоўныя і нязменныя і 114 катэгорыі «Б» – гісторыка-культурныя каштоўнасці поўнасцю або часткова адноўленыя.

Вырашальным фактам у гэтым пытанні стала эфектыўнасць Дзяржаўнай праграмы «Культура Беларусі» на 2016–2020 гг., якая прадугледжвала асобны мэтавы паказчык па штогадоваму ўключэнні ў Дзяржспіс не менш 2 нематэрыяльных культурных каштоўнасцей. У 2017 г. дадзены статус атрымалі 8 нематэрыяльных культурных каштоўнасцей, у 2018 – 3, у 2019 – 8, у 2020 – 17, за 2021 – 10.

Ахова і развіццё нематэрыяльных праяўленняў творчасці чалавека на рэспубліканскім узроўні прызнаны фактарамі сацыяльна-эканамічнага развіцця і замацаваны шэрагам дзяржаўных праграм: Праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2021–2025 гг., Праграма дзейнасці Урада на перыяд да 2025 г. [6, 7]. Развіццё культуры будзе арыентавана на захаванне і памнажэнне нацыянальных культурных каштоўнасцей і традыцый, нацыянальнай ідэнтычнасці і самабытнасці, культурнага кода беларускай нацыі. Важны напрамак дзейнасці – стварэнне нацыянальных культурных брэндаў, развіццё народных промыслаў і рамёстваў, арганізацыя фестываляў народнай творчасці. Дадзеная палітыка ў дачыненні да захавання нематэрыяльнай спадчыны будзе ў далейшым пра-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цягнута і ўзмоцнена, што замацавана ў Нацыянальнай стратэгіі ўстойлівага развіцця да 2035 г.

Інструментам выканання дадзеных задач з’яўляецца Дзяржаўная праграма «Культура Беларусі» на 2021–2025 гг. [4]. Чакаемым вынікам з’яўляецца павелічэнне колькасці нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей, уключаных у Дзяржспіс (не менш 165), у тым ліку ў 2021 г. – 3, у 2022 г. – 5, у 2023 г. – 3, у 2024 г. – 4, у 2025 г. – 4. У 2021 г. у Дзяржспіс уключаны такія элементы як тэхналогіі вырабу драўлянага бандарнага посуду ў г. Іванава, в. Рылавічы Брэсцкай вобласці, велікодны карагод у аграгарадку Маркава Маладзечанскага раёна Мінскай вобласці, ткацтва посцілак у тэхніцы аднабаковага перабору ў Лепельскім раёне і інш [2].

На дзяржаўным узроўні ўдзяляецца пільная ўвага адзначаным пытанням. Міністэрствам культуры сумесна з Беларускім дзяржаўным універсітэтам культуры і мастацтваў аказваецца навукова-метадычнае суправаджэнне выканкамам у інвентарызацыі нематэрыяльных праяўленняў творчасці чалавека, штогод праводзяцца рэспубліканскія навукова-практычныя семінары, курсы павышэння кваліфікацыі для спецыялістаў і кіраўнікоў у сферы аховы гісторыка-культурнай спадчыны.

На рэспубліканскім навукова-практычным семінары ў г. Мінску 29.10.2020 г. былі выпрацаваны рэкамендацыі па ажыццяўленні мерапрыемстваў у сферы аховы нематэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны ў 2021–2022 гг. для мясцовых органаў [9]. Дзякуючы гэтым рэкамендацыям і рашэнням Міністэрства культуры ўпершыню ў кожнай вобласці і г. Мінску ў 2021 г. былі распрацаваны і зацверджаны комплексныя планы мерапрыемстваў на 2021–2025 гг. па захаванні нематэрыяльных праяўленняў творчасці чалавека, уключаных у Дзяржспіс. У прыватнасці, адзначанымі планамі прадугледжваюцца меры, накіраваныя на перадачу ад носьбіта да пераемніка (арганізацыя і падтрымка разнастайных форм пераемнасці), захаванне адметных вартасцей, даследаванні, вывучэнне элементаў (супрацоўніцтва з навукова-даследчымі, адукацыйнымі арганізацыямі), падрыхтоўка прапаноў аб уключэнні новых элементаў у Дзяржспіс, заахвочванні (у тым ліку матэрыяльныя) носьбітаў, маніторынг стану элементаў (раз у два гады), прафілактычныя мерапрыемствы (рэкамендацыі, семінары, канферэн-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цыі), метадычная работа (культурна-асветніцкая работа ўстаноў) і папулярызацыя элементаў.

Мясцовыя органы іграюць важную ролю ў захаванні нематэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны, бо іх умяшанне можа быць эфектыўным для патрэб мясцовых супольнасцей і груп. Яны могуць далучаць да гэтай дзейнасці як грамадскія арганізацыі, так і установы культуры, адукацыі, турызму, навуковыя арганізацыі і г. д.

Задачы і прававыя механізмы па захаванні нематэрыяльна культурнай спадчыны на 2021–2025 гг. замацаваны шэрагам лакальных нарматыўных актаў, у тым ліку ў комплексах мерапрыемстваў па рэалізацыі дзяржаўных праграм, зацверджаных абласнымі Саветамі дэпутатаў.

Удзельнікі рэспубліканскага навукова-практычнага семінара (26.08.2021) прааналізавалі дзейнасць арганізацый культуры і адукацыі Беларусі па выкананні Канвенцыі ў межах падрыхтоўкі перыядычнай нацыянальнай справаздачы ў 2021 г., абмеркавалі стан беларускіх элементаў ЮНЕСКА і задачы на бліжэйшы час.

Адзначана, што ў мэтах арганізацыі работы з міжнароднымі арганізацыямі па беларускім пытаннях у ЮНЕСКА загадам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў ад 13.08.2021 № 44 зацверджана Палажэнне аб стварэнні Цэнтра нематэрыяльнай культурнай спадчыны. Спадзяёмся, што актывізацыя дзейнасці Цэнтра дазволіць удасканаліць дзейнасць па вывучэнню, падтрымцы і пераемнасці нематэрыяльнай спадчыны ў Беларусі. У верасні 2022 г. Рэспубліка Беларусь стане месцам правядзення міжнароднага семінара па абмене вопытам па ахове нематэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны ў краінах СНД.

Пазітыўная дынаміка ў цэлым і значныя поспехі на міжнародным, рэспубліканскім і рэгіянальных узроўнях у справе выяўлення, вывучэння і аховы нематэрыяльных культурных каштоўнасцей, падыходы і рэкамендацыі, выпрацаваныя ў папярэднія гады, дазваляюць упэўнена працаваць у дадзенай сферы і атрымліваць добрыя вынікі.

Дзейнасць па ахове нематэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны адлюстроўвае духоўнае багацце нашай краіны, садзейнічае папулярызацыі традыцыйных каштоўнасцей. У Дзяржспіс уключаны 5 451 матэрыяльных гісторыка-культурных



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

каштоўнасцей і толькі 155 нематэрыяльных, таму неабходна далейшая актыўная работа па выяўленні, асэнсаванні і захаванні духоўных скарбаў нашага народу.


*1.* Асноўныя тэксты Міжнароднай канвенцыі аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны 2003 г. (разам з Аператыўным кіраўніцтвам па выкананні Канвенцыі аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны), Штаб-кватэра ЮНЕСКА, Парыж, 2008 (рэд. 2018) [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: www.unesco.org|culture|ich|en|directives. – Дата доступу: 30.08.2021.

*2.* Гісторыка-культурная спадчына [Электронны рэсурс] // Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. – Рэжым доступу: https://kultura.by/ru/ikn-ru. – Дата доступу: 01.09.2021.

3. Конвенция об охране нематериального культурного наследия: [заключена в г. Париже 17.10.2003, ратифицирована Указом Президента Республики Беларусь от 29.12.2004 № 627] // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь, 04.01.2007 – № 2–3/1975.

*4.* О Государственной программе «Культура Беларуси» на 2021–2025 годы: постановление Совета Министров Республики Беларусь от 29.01.2021 № 53 // Нац. правовой интернет-портал Респ. Беларусь, 06.02.2021 – 5/48756

*5.* Об утверждении Конвенции об охране нематериального культурного наследия: Указ Президента Республики Беларусь от 29.12.2004 № 627 // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь, 11.01.2005 – № 2–1/6117.

*6.* Об утверждении Программы деятельности Правительства Республики Беларусь на период до 2025 года: постановление Совета Министров Республики Беларусь от 24.12.2020 № 758 // Нац. правовой интернет-портал Респ. Беларусь, 30.12.2020 – 5/48637.

*7.* Об утверждении Программы социально-экономического развития Республики Беларусь на 2021–2025 гг.: Указ Президента Респ. Беларусь от 29.07.2021 № 292 // Нац. правовой интернет-портал Респ. Беларусь, 04.08.2021 – 1/19834.

*8.* Нацыянальны інвентар нематэрыяльнай спадчыны Беларусі [Электронны рэсурс] // Жывая спадчына Беларуси. – Рэжым доступу: https://living-heritage.by/. – Дата доступу: 01.09.2021.

*9.* Памятка па ажыццяўленні мерапрыемстваў у сферы аховы нематэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны ў 2021–2022 гадах для мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў абласнога і базавага тэрытарыяльных узроўняў [Электронны рэсурс] // Рэпазіторый Беларус. дзярж. ун-та культуры і мастацтваў. – Рэжым доступу: http://repository.buk.by/handle/123456789/23128. – Дата доступу: 01.09.2021.

*10. Ходор, Г. Н.* Подготовка предложений о расширении Государственного списка историко-культурных ценностей Республики Бела-


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

русь: практические рекомендации / Г. Н. Ходор // Культура Беларуси: реалии современности: VIII Междунар. науч.-практ. конф., посвящ. Году малой родины в Респ. Беларусь, Минск, 10 окт. 2019 г.: сб. науч. статей / Белорус. гос. ун-т культуры и искусств. – Минск, 2019. – С. 538–548.

# ОБРАЗ СМЕРТИ В ПРОИЗВЕДЕНИЯХ М. МУСОРГСКОГО И М. ЕЛЬСКОГО

***Н. Н. Ходинская,***
*кандидат искусствоведения, доцент,*
*доцент кафедры музыки и музыкального образования*
*Белорусского государственного университета культуры и искусств*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Образ смерти появился в европейской словесности и изобразительном искусстве в эпоху Средневековья в популярном жанре *Danse macabre* («Пляска смерти»). Широко известны изображения смерти в виде скелета с косой или без нее, тянущего за собой цепочку людей разного возраста, пола, сословной принадлежности: от короля и папы до монахини и крестьянина. На знаменитой картине XV в. Бернта Нотке, украшающей церковь Святого Николая (Нигулисте) в Таллине, танцующие скелеты, символизирующие смерть, чередуются с фигурами Папы Римского, императора, кардинала, короля, образуя своеобразный хоровод (сохранился лишь фрагмент из 13 фигур). Кульминацией в развитии жанра плясок смерти явился цикл из 41 гравюры немецкого художника Ганса Гольбейна Младшего (1497–1543), на которых смерть не просто танцует со своими жертвами, а вмешивается в повседневную жизнь людей, обличает людские пороки и даже вершит правосудие.

В XIX в. сюжет плясок смерти вошел и в музыкальное искусство, обогатив его такими выдающимися произведениями, как «Пляска смерти» (или *Totentanz*) для фортепиано с оркестром Ф. Листа, «Пляска смерти» (или *Danse macabre*) для скрипки с оркестром К. Сен-Санса, вокальный цикл «Песни и пляски смерти» М. Мусоргского, «Танец смерти» для скрипки и фортепиано М. Ельского. В статье рассматриваются особенности воплощения образа смерти в произведениях восточноевропейских романтиков – М. Мусоргского и М. Ельского.

Образ смерти присутствует во многих сочинениях М. Мусоргского, но лишь в вокальном цикле «Песни и пляски смер-